**Шашачны турнір " Ваш ход»**

4 чэрвеня 2021 года традыцыйна прайшоў IV міжраённы турнір па шашках «Ваш ход» сярод людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Турнір быў арганізаваны работнікамі аддзялення дзённага знаходжання інвалідаў ДУ «ТЦСАН Ашмянскага раёна» і праведзены на базе ДУК "Ашмянскі раённы цэнтр культуры».

Дадзенае мерапрыемства прысвечана 680-годдзю з дня заснавання г. Ашмяны.

У спаборніцтвах удзельнічалі атрымальнікі паслуг аддзяленняў дзённага знаходжання інвалідаў 3-х раёнаў (Астравецкі, Смаргонскі і Ашмянскі). Па выніках турніру месцы сярод раёнаў размеркаваліся наступным чынам: 1 месца-Ашмянскі, 2 месца-Ашмянскі (ГА "БелТІЗ"), 3 месца-Смаргонскі. Лепшыя гульцы: г. Ашмяны-Атрашкевіч Святлана, Ціханскі Ігар, Гарашкевіч Вікторыя Семянюк Вольга, г.Смаргонь - Клуйшо Вадзім, Залескі Павел. Удзельнікі турніру ўзнагароджаны медалямі, дыпломамі і падарункамі.

Для балельшчыкаў каманд была арганізавана гульнявая пляцоўка "Вясёлыя шашкі" (конкурсы, эстафеты, гульні, майстар-клас і т.д.). Рабята праявілі кемлівасць, спрыт і ўвагу. Лепшых чакалі салодкія падарункі і прызы.










saint
spring








VANS